УДК 37.01:94

# КАНЦЭПЦЫЯ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ НАВУЦЫ І ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

**С.В. Мяньчэня**
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Канцэпцыя вуснай гісторыі *(oral history)* мае дастаткова глыбокія карані, у розныя часы аўтары пры стварэнні гістарычных хронік абапіраліся на вусныя сведчанні сучаснікаў. Але як асобны накірунак гістарычнай навукі вусная гісторыя фарміруецца толькі ў другой палове XX ст. Гэта стала вынікам развіцця тэхналогій (распаўсюджванне і ўдасканаленне гуказапісваючай апаратуры) і пошуку новых крыніц. Вусныя крыніцы лічацца часткай навуковай супольнасці недаставернымі, але наколькі даставернымі і пазбаўленымі прадузятасці і цэнзуры з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы розных часоў - ад сярэдневечных летапісаў да сродкаў масавай інфармацыі XX – XXI стст.?

Асноўным даследчым метадам вуснай гісторыі з'яўляецца інтэрв'ю. Даследчы працэс складаецца з непасрэднага запісу, архівацыі, аналіза і інтэрпрэтацыі атрыманай інфармацыі [1, с. 3]. Аб'ектамі вуснай гісторыі з'яўляюцца: вусныя традыцыі – сведчанні, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне; навуковая біяграфістыка – запіс гісторыі жыцця асобнага чалавека; сведчанні людзей, якія самі з'ўляліся відавочцамі пэўных падзей [2, с. 45].

Інфармацыя вуснай гісторыі мае важнае навуковае значэнне, яна выходзіць за межы этнаграфічных і гістарычных даследванняў і цесна звязана з вывучэннем ментальнасці, грамадскай думкі, у сувязі з чым можа прымяняцца ў філасофіі, псіхалогіі і сацыялогіі. Каштоўнасць такой інфармацыі ў тым, што яна паказвае гістарычны працэс вачыма людзей, дзякуючы захаванню эмоцыянальнага фона лепш успрымаецца аўдыторыяй, пазбаўлена ідэалагічных канонаў і цэнзуры, але з гэтай свабодай звязаны і яе недахопы – суб'ектыўнасць і праблема ўсталявання ступені даставернасці. Вусная інфармацыя часта з'яўляецца



Репозиторий БГАТУ

суб'ектыўнай і залежыць ад асабістых поглядаў чалавека, яго ўзроста, адукацыі. Яшчэ адной спецыфічнай рысай вусных крыніц з'яўляецца іх непаўторнасць. Вядомы выпадкі, калі розным даследчыкам адзін рэспандэнт даваў розную інфармацыю, ці інтэрпрэтацыю падзей. Важнае значэнне мае і асоба даследчыка, яго ўменне выклікаць давер у суразмоўцы і накіроўваць яго думкі. У беларускай гістарычнай навуцы вусная гісторыя цесна звязана з такімі накірункамі як гісторыя паўсядзённасці, перыяд нацысцкай акупацыі, палітычныя рэпрэсіі і калектывізацыя сельскай гаспадаркі 1930-40-х гг., краязнаўства. За апошнія 20 год беларуская гістарыяграфія папоўнілася новымі артыкуламі і манаграфіямі, створанымі дзякуючы метадам вуснай гісторыі. Вынікам працы беларускіх даследчыкаў А. Смалянчука, І. Кашталян, Н. Гардзіенкі і інш. стала стварэнне ў 2011 г. унікальнага па зместу інтэрнет-рэсурса – Беларускага архіва вуснай гісторыі. Архіў з'яўляецца on-line сховішчам электронных крыніц вуснай гісторыі, суправаджальнай інфармацыі і публікацый, якія даступны да прагляду, праслухоўвання і спампавання зарэгістраваным карыстальнікам, пры умове абавязковай спасылкі на архіў [3]. Матэрыялы вуснай гісторыі могуць выкарыстоўвацца і ў працэсе выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін гістарычнага і філасофскага профілю. Адной з форм такой працы можа стаць аналіз існуючай крыніцы пры вывучэнні адпаведнай тэмы, што дазволіць пашырыць вучэбны матэрыял. Напрыклад, замацаваць веды пра падзеі нацысцкай акупацыі Беларусі 1941-1944 гг. дапамогуць успаміны людзей, якія здолелі выжыць у спаленых вёсках, канцлагерах, цывільнага насельніцтва, дзяцей, тых, хто прымаў удзел у партызанскім, ці падпольным руху. Абавязковым з'яўляецца і працэс абмеркавання пачутай інфармацыі, што паспрыяе фарміраванню навыкаў крытычнага аналізу крыніцы, фармулявання і адстойвання сваіх думак.

Яшчэ адным накірункам працы можа стаць матывацыя студэнтаў на стварэнне новых вусных крыніц. Выкладчыкамі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай працы студэнтаў, як падрыхтоўка паведамленняў па тэмах "Успаміны маіх сваякоў аб Вялікай Айчыннай вайне", "Гісторыя маёй сям'і", "Гісторыя маёй вёскі" і г.д.



Репозиторий БГАТУ

Выкананне гэтых заданняў патрабуе ад студэнтаў актыўнай дзейнасці, замест пошуку чужых аналагічных прац ці акадэмічных, "гатовых" ведаў ідзе працэс фарміравання навыкаў збору, апрацоўкі і аналізу інфармацыі і мінімалізуецца магчымасць плагіята. Нестандартная тэматыка і метады працы дапамагаюць падтрымліваць у студэнтаў інтарэс да дысцыпліны, пачуццё гонару за сваю сям'ю і малую Радзіму. Пры гэтым на выкладчыка кладзецца адказнасць не толькі за арганізацыю навуковага працэса і захаванне сабранай інфармацыі, але і за яе інтэрпрэтацыю. Пакуль што дадзеная форма працы ўжываецца эпізадычна (па аб'ектыўных прычынах ёй не могуць быць ахоплены ўсе), а паведамленні складаюцца ў вольнай форме, але ў планах кафедры стварэнне спецыяльных апытальнікаў, якія не толькі дазволяць аблегчыць працу студэнтам, але і сістэматызаваць і захаваць атрыманую інфармацыю, а у далейшым, магчыма, увесці яе ў навуковы зварот.

Такім чынам, можна адзначыць, што вусная гісторыя сёння мае дастаткова вялікі патэнцыял у гістарычнай навуцы. Вусныя крыніцы не могуць выцясніць дакументальныя, але яны здольны шмат у чым дапоўніць даследванні. У сваю чаргу выкарыстанне крыніц і метадаў вуснай гісторыі ў працэсе выкладання гістарычных дысцыплін дазволіць узбагаціць вучэбны матэрыял і будзе спрыяць як фарміраванню даследчыцкіх навыкаў, так і грамадзянска-патрыятычных пачуццяў.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Смалянчук, А. Вусная гісторыя і культура памяці ў Беларусі / А. Смалянчук // Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: http://www.nashapamiac.org/docs/BAVH%20-%20Uvodziny%20u%20kancepcyju%20archiva.%20A.%20Smaliančzuk.pdf. Дата доступа: 23.10.2017.
2. Щеглова, Т.К. Устная история: учеб. Пособие / Т.К. Щеглова. Барнаул: АлтГПА, 2011. – 364 с.
3. Беларускі архіў вуснай гісторыі [Электронны рэсурс]. Рэжым доступа: http://www.nashapamiac.org. Дата доступа: 23.10.2017.



Репозиторий БГАТУ